# Андрэй КОЛАСАЎ

эстрадны спявак, вядучы, акцёр



**1986**

Андрэй Валер'евіч Коласаў нарадзіўся 12 сакавіка ў Гомелі ў музычнай сям'і.
З дзяцінства займаўся музыкай, наведваў заняткі па класе класічнай гітары ў музычнай школе.

**2003—2007**

Пасля школы канчае кулінарны каледж і працуе поварам у рэстаране ў Гомелі. Там жа пачынае выступаць як спявак і вядучы. Паступае ў Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання.
У 2007 годзе, пасля праслухоўвання ў Гомельскай абласной філармоніі, трапляе ў аркестр Ю. Васілеўскага, дзе пачынае больш шчыльна працаваць над вакалам.

Бярэ ўдзел у міжнародным фестывалі эстраднай творчасці ў Гомелі (2008) і конкурсе эстраднай творчасці на "Славянскім базары" (2009), дзе становіцца лаўрэатам II прэміі і атрымлівае спецыяльную прэмію імя Уладзіміра Мулявіна. У 2010-м становіцца дыпламантам XIX Міжнароднага фестывалю "Адкрыццё" ў г. Варна (Балгарыя), лаўрэатам III прэміі на рэспубліканскім конкурсе маладых выканаўцаў "Маладзечна-2011". Удзельнічае ў вакальных конкурсах у Расіі, Малдавіі, Грузіі і Украіне. Удзельнічае ў тэлевізійным праекце "Акадэмія талентаў" на АНТ.

**2009—2013**

Сканчвае Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання (2013). Запрашаецца ў Мінск, дзе прымаецца вакалістам у склад Нацыянальнага народнага аркестра І. Жыновіча. Паступае ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, дзе вучыцца па спецыяльнасці "эстрадна-джазавыя спевы" ў Ірыны Дарафеевай.

**2013—2019**

Падчас навучання ва ўніверсітэце прымае ўдзел у мюзіклах "Дуброўскі", "Казанова", "Джэйн Эйр", над якімі працавалі вядомыя кампазітар Кім Брэйтсбург і пастаноўшчык Мікалай Андросаў. Паралельна развіваецца і як прафесіянальны вядучы мерапрыемстваў, працягвае ўдзельнічаць у творчых конкурсах.

Прымае ўдзел ва ўкраінскіх тэлевізійных шоу "Голас краіны" (2013), двойчы ў музычным шоу талентаў "Х-фактар" (2015, 2017). З'яўляецца ў праектах і на беларускім тэлебачанні. Напрыклад, у перадачы аб фальклорнай спадчыне Беларусі "Наперад у мінулае". У 2016-м удзельнічае ў першай у Беларусі "Бітве вядучых", дзе займае другое месца. Працягвае развівацца на гэтай ніве.



Урачыстае ўзнагароджанне медалём імя Ф. Скарыны, 2023 г.



Падчас выступу на "Х-фактар", 2017 г.



У мюзікле "Дуброўскі", 2019 г.

**2019—2022**

Стажыруецца ў Даўгаўпілсе, дзе выступае ў тэатры як артыст-спявак. Актыўна выступае і на беларускай сцэне. З 2021 г. — саліст у аркестры М. Фінберга. З'яўляецца ў якасці вядучага на II Еўрапейскіх гульнях і на Чэмпіянаце Еўропы па фігурным катанні. Папаўняе ўласны рэпертуар новымі лірычнымі песнямі, сярод якіх "Сам-насам з сабой", "Стану тваім сапраўдным мужчынам", "Мы — народ".

Летась з'явіўся ў другім сезоне беларускага шоу талентаў "Фактар.BY". Спявак трапіў у дзясятку фіналістаў і вылучыўся вакальнай разнастайнасцю песень падчас прамых уключэнняў.

**2023**

Сёння Андрэй Коласаў — адзін з самых актыўных і рознабаковых спевакоў на беларускай эстрадзе. За плённую працу, высокі прафесіяналізм і значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры ўзнагароджаны медалём імя Францыска Скарыны. Працягвае развівацца як прафесіянальны event-вядучы і сольны артыст.

Сёлета спявак з'яўляўся ў эфіры праграмы "Сэнс жыцця" на "Беларусь-1", дзе распавёў пра свой творчы і жыццёвы шлях. Яго рэпертуар працягвае папаўняцца новымі песнямі. Зараз Андрэй Коласаў рыхтуе сольную праграму.




Летам 2023 адбыўся рэліз новай песні — "Тая"

Вакальныя здольнасці, харызма і творчая пластычнасць Андрэя Коласа дазваляюць яму рэалізоўвацца ў самых розных культурных амплуа. Спявак, акцёр і вядучы, ён застаецца адкрытым для творчых эксперыментаў, чым нязменна падкупляе сваю аўдыторыю.

**АФІША:**
15 снежня ў Палацы Рэспублікі адбудзецца канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага аркестра імя М. Фінберга, у складзе якога выступіць і Андрэй Коласаў.